**Вучэбная дысцыпліна “Тэорыя маўленчых жанраў”**

**спецыяльнасць 1- 21 80 11 Мовазнаўства на другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратура)**

**Лекцыя**
**на тэму “Узнікненне і развіццё тэорыі маўленчых жанраў”**

План

1. Мова і маўленне. Механізм маўленчай дзейнасці чалавека.
2. Развіццё ТМЖ. Працы М.Бахціна.
3. Азначэнне паняцця *маўленчы жанр*.
4. Развіццё ідэй М. Бахціна яго паслядоўнікамі. Два напрамкі развіцця ТМЖ.
5. Лінгвістычны напрамак. Генрыстыка.
6. Анкета маўленчага жанру.
7. Прагматычнае жанразнаўства.

**1** ***Мова і маўленне. Механізм маўленчай дзейнасці чалавека.***

Зносіны людзей у грамадстве ажыццяўляюцца дзякуючы маўленчай дзейнасці чалавека. Маўленне – працэс зносін пры дапамозе моўных элементаў, паслядоўнай арганізацыі моўных адзінак у адпаведнасці з выражаемай інфармацыяй.

Якім з’яўляецца механізм (утварэнне) маўленчай дзейнасці? Адказ на гэта пытанне дае псіхалінгвістыка. Маўленне чалавека падзяляецца на знешняе і ўнутранае. Знешняе маўленне мае гукавое выражэнне, унутранае – адбываецца ў свядомасці, мысленчай дзейнасці чалавека.

Структура маўлення ўключае тры кампаненты: матыў, думку і знешняе маўленне. Матыў і знешняе маўленне звязваюць унутраны механізм са знешнімі этапамі акту маўлення (схема Лурыя).

Матыў

↓

Думка

(лексічнае разгортванне
семантычнае праграмаванне
граматычнае канструяванне
акустыка-артыкуляцыйнае афармленне)

↓

Знешняе маўленне

Сярэдні кампанент – думка – уключае рад прамежкавых этапаў, звязаных з рознымі ступенямі пераходу ад думкі да знешняга маўлення: *лексічнае разгортванне* (пошукі ў памяці неабходных слоў для выражэння

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

паняццяў і выказвання думкі, акрэсліванне семантычнага аб'ёму выбранага слова і яго кантэкстуальнага значэння), *семантычнае праграмаванне* (вызначэнне агульнай структуры выказвання і яе асноўных сэнсавых кампанентаў – суб'екта, аб'екта, прэдыката, а таксама ўстанаўленне схемы выказвання , якая звычайна ўключае два кампаненты – тэму і рэму), *граматычнае канструяванне* (граматычнае афармленне слова, выбар яго формы і асацыятыўная сувязь з іншымі словамі, звязанымі з ім семантычна і сінтагматычна), *акустыка-артыкуляцыйная арганізацыя* выказвання (яго агучванне).

Механізм канструявання выказвання звязаны з аператыўнай памяццю чалавека. Агучванне маўлення выконвае артыкуляцыйны і складаўтваральны механізм маўленчага апарата.

Гэтыя этапы ўнутранай маўленчай дзейнасці забяспечваюцца работай некалькіх маўленчых механізмаў, размешчаных у кары галаўнога мозга. Яны працуюць адначасова, паралельна і аўтаматычна.

*Функцыі мовы і кампаненты маўлення.*

Функцыяй мовы называецца выкарыстанне з пэўнай мэтай ў маўленні патэнцыяльных уласцівасцей моўных сродкаў. У маўленчай дзейнасці рэалізуюцца розныя функцыі мовы.

Функцыі мовы разглядаюць звычайна, спасылаючыся на Р. Якабсона, у сувязі з кампанентамі маўленчага акту. Пад маўленчым актам разумеецца размова некалькіх асоб, дыялог, наяўнасць адрасата і адрасанта.

| Кампаненты маўлення | Функцыі мовы |
|---|---|
| Адрасант – аўтар маўлення, той, хто перадае інфармацыю. | Эматыўная функцыя – адносіны аўтара да зместу паведамлення, выражэнне яго пачуццяў і волі. |
| Адрасат – слухач, чытач, той, хто атрымлівае інфармацыю. | Апелятыўная функцыя – уздзеянне на адрасата, зварот да яго, імкненне выклікаць думку, адэкватную выказанай. |
| Кантэкст – тое, пра што ідзе размова, прадмет разважання, рэферэнт. | Рэферэнтная функцыя – абазначэнне прадметаў рэчаіснасці, паведамленне, перадача інфармацыі, у выніку чаго адбываецца камунікатыўны акт. |
| Код – сістэма знакаў, пры дапамозе якіх перадаецца інфармацыя. | Тлумачальная (метамоўная) функцыя, накіраваная на раскрыццё |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | |
|---|---|
| | ўласцівасцей кода. |
| <u>Кантакт</u> – узаемаразуменне, сувязь паміж адрасатам і адрасантам. | <u>Фатычная функцыя</u> – устанаўленне і падтрымка кантакту з адрасатам (прывітанні, звароты, пытанні, жэсты, міміка – моўныя і пазамоўныя сродкі) |
| <u>Паведамленне</u>. | <u>Паэтычная функцыя</u> – імкненне зрабіць сваю інфармацыю выразнай, даходлівай і зразумелай. |

У працэсе выкарыстання моўных сродкаў могуць выдзяляцца, падкрэсліваецца асобныя функцыі – у многіх жанрах публіцыстычнага стылю (рэкламе, агітацыйных сродках) на першы план выступае апелятыўная функцыя, у навуковым паведамленні – рэферэнтная, у паэтычным творы – эматыўная і г.д. Перавага адной з гэтых функцый стварае асобныя віды маўленчай дзейнасці, функцыянальныя стылі мовы.

Не ўсе з пералічаных функцый мовы з'яўляюцца раўназначнымі. Важнейшая функцыя – камунікатыўная функцыя мовы як важнейшага сродку зносін людзей, функцыя паведамлення, якая робіць магчымым абмен думкамі і, як вынік гэтага, – зносіны пры дапамозе мовы. Гэту функцыю называюць таксама камунікатыўна-інфармацыйнай. Важнай і старажытнай з'яўляецца апелятыўная функцыя ўздзеяння на адрасата.

Некаторыя вучоныя (Лявонцьеў, Кайнц, Аммер) выдзяляюць функцыі мовы абавязковыя (першасныя – камунікатыўная, функцыя авалодвання грамадска-гістарычным вопытам чалавецтва) і факультатыўныя (экспрэсіўная, эстэтычная, дыякрытычная).

## 2 *Развіццё ТМЖ. Працы М.Бахціна*

Сучасная тэорыя культуры маўлення звязана з вывучэннем не толькі стылявых, але і жанравых адрозненняў форм маўленчых зносін, паколькі любы тэкст можна разглядаць як адлюстраванне пэўнага тыпу маўленчага жанру.

Уяўленне пра маўленчы жанр было пакладзена ў свой час у аснову вызначэння функцыянальнага стылю ў канцэпцыі Пражскай лінгвістычнай школы, якія звязвалі паняцце маўленчага жанру з функцыямі маўлення.

У XX ст. у моваэнаўстве пачала фарміравацца тэорыя маўленчых жанраў, якая з'яўляецца адным з найбольш актыўна развіваемых напрамкаў даследавання маўлення. Само паняцце "маўленчы жанр" упершыню было сфармулявана ў працах М. Бахціна.

Як адзначае В.В. Дзяменцьеў, размежаванне маўленчых жанраў і мовы як розных тыпаў камунікатыўных атрактараў, якія адрозніваюцца

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ступенню сваёй цвёрдасці (жорсткасці), звязана з канцэпцыяй М.М. Бахціна.

У артыкуле “Проблема речевых жанров” М. Бахцін адзначае: “Жанравыя формы, у якія мы адліваем наша маўленне, істотна адрозніваюцца ад форм мовы ў плане іх устойлівасці і абавязковасці (нарматыўнасці) для гаворачых. Яны больш гнуткія, пластычныя і свабодныя, чым формы мовы. І ў гэтым разнастайнасць маўленчых жанраў вельмі вялікая”. Маўленчыя жанры і мова – гэта дзве розныя стадыі агульнага працэсу фармалізацыі камунікацыі.

**3** ***Азначэнне паняцця маўленчы жанр***

Мова, паводле М.Бахціна, існуе ў сістэме маўленчых адзінак і ў сістэме маўленчых форм (жанраў), рэалізуецца ў працэсе маўленчага акта ў выказваннях, форму якіх і складаюць маўленчыя жанры. Маўленчае ўзаемадзеянне людзей, камунікатыўная тактыка і стратэгія маўленчых паводзін у самых розных маўленчых сітуацыях рэалізуецца з улікам вялікай колькасці розных маўленчых жанраў.

М. Бахцін выказваў разуменне МЖ у розных працах: «Закончанае пытанне, вокліч, загад, просьба – вось найбольш тыповыя жыццёвыя выказванні». «Пра пэўныя тыпы жанравых разнавіднасцей ў паўсядзённым маўленні можна гаварыць толькі там, дзе існуюць устойлівыя, замацаваныя побытам і абставінамі формы жыццёвых зносін» (1979). У позніх працах Бахцін трактуе гэта паняцце больш падрабязна: Маўленчы жанр – адзіная першасная форма існавання мовы. «Калі б маўленчых жанраў не існавала, і мы не валодалі б імі, калі б нам прыйшлося б іх ствараць упершыню ў працэсе зносін, упершыню будаваць кожнае выказванне, маўленчыя зносіны былі б амаль не магчымымі».

Маўленчы жанр існуе ў пэўнай сітуацыі зносін, мае ўласную “нарматыўную” экспрэсію і абавязкова адрасаваны, г. зн. змяшчае ў сабе канцэпцыю адрасата і рэакцый у адказ.

Кожная маўленчая сфера выпрацоўвае ўласны рэпертуар маўленчых жанраў, мова ж у цэлым валодае наменклатурай маўленчых жанраў. Паўсядзённыя зносіны фарміруюць першасныя маўленчыя жанры, на аснове якіх культывуецца сістэма другасных, у тым ліку літаратурных жанраў.

**Маўленчыя жанры**, па Бахціну, - гэта ўстойлівыя тэматычныя, кампазіцыйныя і стылістычныя тыпы выказванняў. Бахцін выдзяляе першасныя (простыя) маўленчыя жанры, якія натуральна складаліся ў працэсе практыкі паўсядзёных зносін, і другасныя (складаныя, комплексныя) маўленчыя жанры, якія выкарыстоўваюцца ва ўсіх сферах зносін. Другасныя маўленчыя жанры выпрацоўваюцца на аснове першасных, яны падпадаюць больш складанай стандартызацыі, унармаванню. Гэта сукупнасць тыповых мадэлей пабудовы маўленчага цэлага, разнастайныя праявы тыповых форм выказвання.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Другасныя (складаныя) маўленчыя жанры – раманы, драмы, навуковыя даследаванні, вялікія публіцыстычныя жанры і інш. узнікаюць ва ўмовах больш складанага і адносна высокаразвітых і арганізаваных культурных зносін (пераважна пісьмовых): мастацкіх, навуковыз, грамадска-палітычных і інш.

### 4 *Развіццё ідэй М. Бахціна яго паслядоўнікамі. Два напрамкі развіцця ТМЖ*

Дзяменцьеў В.В. сцвярджае: Ідэі М. Бахціна актыўна развіваюцца яго паслядоўнікамі. Айчынныя даследчыкі, якія развіваюць ідэі Бахціна, звязваюць ТМЖ з замежнымі тэорыямі маўленчых актаў (Дж. Осцін, Дж. Сёрль) або канцэпцыяй моўных гульняў (Л. Вітгенштейн).

У наш час развіваюцца два асноўныя напрамкі тэорыі маўленчых жанраў (МЖ) – лінвістычнае вывучэнне МЖ (генрыстыка) і прагматычнае вывучэнне МЖ – (жанразнаўства). Даследуюцца розныя аспекты МЖ: тэкставыя асаблівасці, стылістычныя, псіхалінгвістычныя, культуралагічныя аспекты, маўленчыя жанры і ерытарычныя жанры, педагогіка, гісторыя.

У сучаснай тэорыі МЖ намячаецца тэндэнцыя да абагульнення, ствараюцца канцэпцыі, якія пашыраюць паняцце жанру, прымяняюць яго не толькі да вербальнай і невербальнай камунікацыі, але і да нацыянальнай і агульначалавечай культуры ў цэлым. Заканамернасці жанравай арганізацыі маўлення разглядаюцца ў сувязі з агульнымі законамі камунікатыўнай і некамунікатыўнай дзейнасці.

Пад **маўленчымі жанрамі** ў сучасным мовазнаўстве разумеюць “класы выказванняў, якія маюць агульныя рысы ў камунікатыўнай, семантычнай і фармальнай арганізацыі”.

Тыповы маўленчы жанр паўсядзённых зносін з’яўляецца сцэнарыем (фрэймам) камунікатыўнай сітуацыі, які прысутнічае ў свядомасці моўнай асобы і кіруе яго маўленчымі паводзінамі. Паколькі маўленчыя зносіны – гэта заўсёды камунікатыўнае ўзаемадзеянне паміж гаворачым (адрасантам, аўтарам) і слухачом (адрасатам), то межы кожнага канкрэтнага выказвання вызначаюцца зменай суб’ектаў маўлення (гаворачых) – М.М. Бахцін.

Такім чынам, **маўленчы жанр** – гэта тыповая форма маўленчага выказвання, якая праяўляецца ва ўзаемадзеянні ўдзельнікаў камунікацыі (камунікантаў): адрасата і адрасанта.

У розных даследаваннях прадстаўлены розныя канцэпцыі жанру, даецца рознае яго азначэнне (Анна Вяжбіцкая, Вадзім Віктаравіч Дзяменцьеў, Таццяна Рыгораўна Вінакур, Таццяна Віктараўна Шмялёва – распрацоўваюць тыпалогію жанраў).

### 5 *Лінгвістычныя аспекты вывучэнне МЖ, або генрыстыка*.

Развіццё тэорыі МЖ можна прадставіць у семіятычнай парадыгме “семантыка — сінтактыка — прагматыка” (В.В. Дзяменцьеў).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Лінгвацэнтрычная традыцыя можа быць ахарактарызавана як семантыка або як сінтактыка.

Камунікатыўная генрыстыка дазваляе вывучаць жанравую сістэмнасць як з фармальнага, так і са змястоўнага аспекта мовы (сінтактыку, семантыку і прагматыку МЖ), улічваючы дыялагічную сутнасць МЖ, адрозненне маўленчых і рытарычных жанраў, першасных і другасных МЖ.

Семантыка тэксту даследуе яго змест, знешне і ўнутрана выражаны. Гэта тлумачэнне зместу тэксту, яго інтэрпрэтацыя.

Сінтактыка тэксту вывучае яго структуру, спосабы звязнасці тэксту, стварэнне яго цэласнасці, узаемасувязь тэмы і рэмы ў працэсе разгортвання зместу.

Прагматыка тэксту займаецца вывучэннем адносін да паведамлення, выяўленнем сувязі адрасат – адрасант: аўтар – чытач, аратар – слухач. Яна разглядае маўленчыя паводзіны людзей, тыпы маўленчага ўзаемадзеяння на ўзроўні асобнага выказвання або тэксту.

Методыка сістэмна-структурнага і функцыянальнага лінгвістычнага аналізу засноўваецца на рэканструкцыі сістэмы базавых адзінак і стварэнні мадэлей МЖ.

### 6 ***Анкета маўленчага жанру***

У ліку найбольш значных лінгвістычных мадэлей, якія паспяхова выкарыстоўваюцца для вывучэння МЖ, неабходна адзначыць”анкету маўленчага жанру” Т.В. Шмялёвай.

Анкета маўленчага жанру Т.В. Шмялёвай апісвае прыкметы МЖ.

*Жанраўтваральныя прыкметы МЖ*:

1. Важнейшай прыкметай любога МЖ з’яўляецца камунікатыўная **мэта** - намер, інтэнцыя, воля, задума - ілакуцыйны намер аўтара, звернуты да адрасата.

У сувязі з мэтай Шмялёвай былі выдзелены 4 мадэлі (тыпы) МЖ, якія склалі аснову тыпалогіі МЖ:

- *інфармацыйныя жанры* звязаны з імкненнем аўтара адправіць або атрымаць пэўнае паведамленне: гэта можа быць прад’яўленне або запыт інфармацыі, яе пацвярджэнне або абвяржэнне - паведамленне, аб’ява, лекцыя, даклад (інтэнцыя - паведамляць,абвяргаць, сведчыць);

- *ацэначныя МЖ* – мэта - суаднясенне ўчынкаў, якасцей, паводзін і іншых праяўленняў удзельнікаў зносін з прынятай у дадзеным грамадстве шкалой каштоўнасцей – пахвала, камплемент, асуджэнне, знявага і інш. (добра - дрэнна)

- *імператыўныя жанры*, мэта якіх – выклікаць ажыццяўленне або неажыццяўленне дзеянняў, падзей, неабходных, пажаданых або непажаданых, небяспечных для ўдзельнікаў зносін (просьба, распараджэнне, загад, запрашэнне);

-*этыкетныя МЖ,* іх мэта – ажыццяўленне пэўнай падзеі, учынка ў сацыяльнай сферы міжасобасных адносін, прадугледжаных этыкетам

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дадзенага соцыума (прывітанні, развітанні, віншаванні, спачуванні, прабачэнні, падзякі).

У сучасным жанразнаўстве жанры паўсядзённых зносін прынята таксама падзяляць на інфармацыйныя і фатычныя. Інфармацыйныя – паведамленне або атрыманне інфармацыі, фатычныя – маюць функцыю падтрымкі зносін або міжасобасных адносін (са знакам + або -). Да фатычных маўленчых жанраў адносяць камплемент, флірт, вольную гутарку, спрэчку і інш. – В.В. Дзяменцьеў.

2. Жанраўтваральная прыкмета - **вобраз аўтара**.

Вобраз аўтара асэнсоўваецца адносна адрасата. Ён адрознівае жанры ўнутры названых тыпаў:

1) невыканаўчыя – МЖ, з дапамогай якіх аўтар прымушае (схіляе) да дзеяння адрасата –загад, просьба, дазвол (ты, ён-жанр).

2) выканаўчыя МЖ, калі аўтар – выканаўца: клянецца, абяцае, пагражае выканаць сам (я-жанр).

3) “сумесныя” МЖ (дагавор паміж удзельнікамі камунікацыі, заклік да сумесных дзеянняў) (мы-жанры).

3. Жанраўтваральная прыкмета - **вобраз адрасата**.

Кожны з названых тыпаў МЖ прадугледжвае свой вобраз адрасата.

Вобраз аўтара і вобраз адрасата – сіметрычныя жанраўтваральныя прыкметы, якія прадстаўляюць інфармацыю пра двух удзельнікаў зносін: гаворачым (пішучым) і слухаючым (чытаючым). Гэта інфармацыя закладзена ў тыпавы праект МЖ і забяспечвае яму паспяховае камунікатыўнае ажыццяўленне і прагматычную каштоўнасць.

4. Жанраўтваральная прыкмета – **дыктум (падзея).**

Тып дыктумнага (падзейнага) зместу – гэтая жанрастваральная прыкмета звернута да пазамоўнай рэчаіснасці. За кожным маўленчым жанрам стаіць пэная падзея рэчаіснасці. Для дыктума важны характар удзельнікаў зносін (актантаў), адносіны паміж імі і ўдзельнікамі маўленчага дзеяння, часавая перспектыва падзеі, яго ацэнта. Лац. dictum “сказанае” – тое, пра што сказана.

. Гэта падзейная аснова выказвання, прапазіцыйная яго частка, “прадметна-сэнсавая вычарпанасць”.

5. Жанраўтваральная прыкмета - **фактар мінулага**.

Падзеі зносін, якія папярэднічалі дадзенаму МЖ.

6. Жанраўтваральная прыкмета - **фактар будучага**.

Улік магчымасцей рэакцыі адрасата ў адказ на МЖ. Перлакуцыя. Вобразы (фактары) мінулага і будучага – таксама дзве сіметрычныя жанраўтваральныя прыкметы, звязаныя месцам кожнага жанра ў ланцугу маўленчых зносін. Яны ўказваюць на тое, што для кожнага маўленчага жанру істотныя папярэдні і наступны эпізоды зносін. Вобраз мінулага закранае ініцыяльныя маўленчыя жанры, якія пачынаюць зносіны і жанры, якія могуць з’явіцца толькі пасля гэтых зносін як рэакцыя. Адказ - рэакцыя на пытанне, згода – рэакцыя на прапанову і інш..

7. **Фармальная арганізацыя** – моўныя прыкметы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Поўнае апісанне маўленчых жанраў прадугледжвае выяўленне сістэмы рэпрэзентацыі кожнага МЖ, у якой павінны быць улічаны прамыя і ўскосныя рэпрэзентацыі, а сярод кожнага з гэтых тыпаў клішэ і канструкты.

Параметры моўнай рэалізацыі маўленчых жанраў характарызуюцца перш за ўсё з пазіцыі аўтара, ад яго ілакуцыйнага намеру, інтэнцыі да ўвасаблення ў адпаведных моўных формах. У кожным жанры ёсць свой спектр магчымасцей яго рэалізацыі – лексічныя, граматычныя і сінтаксічныя рэсурсы жанру. Апісанне гэтай рэалізацыі складае лінгвістычны партрэт МЖ.

### 7 *Прагматычнае жанразнаўства*

Прагматычнае жанразнаўства — у якасці галоўнага прынцыпу вылучае дыялог, сацыяльнае ўзаемадзеянне ў канкрэтнай сферы. Іх аб'ядноўвае камунікатыўны падыход.

В.В. Дзяменцьеў: Мы разумеем жанры як сродак фармалізацыі сацыяльнага ўзаемадзеяння.

Маўленчыя жанры як камунікатыўныя атрактары (рэгулятары) накладваюць абмежаванне на інтэрпрэтацыю маўленчых выказванняў, робяць яе больш стандартнай і зніжаюць ступень няпэўнасці камунікацыі. Жанры прымаюць самы актыўны ўдзел у арганізацыі і інтэрпрэтацыі семантыкі камунікатыўнай сітуацыі. Жанры павышаюць дзейснасць камунікатыўных дзеянняў, надаюць маўленню большую арганізаванасць, сістэмнасць.

І маўленчыя жанры, і мова як мадэлі пабудовы і разумення маўлення, адносяцца да найбольш эфектыўных сродкаў узаемадзеяння чалавека са светам у працэсе камунікацыі. У гэтым праяўляецца сутнаснае адзінства мовы і жанраў. Аднак жанры як універсальны атрактар і сродак індывідуалізацыі з'яўляюцца галоўным і адзіным абгрунтаваннем маўленчай сістэмнасці, аўтаномнай у адносінах да мовы.

**Пытанні для замацавання**:

1 Як суадносяцца паняцці *мова* і *маўленчая дзейнасць ?*

2 Якой з'яўляецца структура маўлення?

3 Як ажыццяўляецца механізм маўленчай дзейнасці?

4 Як суадносяцца функцыі мовы з кампанентамі маўлення?

5 Як і кім фарміравалася тэорыя маўленчых жанраў?

6 Хто сфармуляваў паняцце маўленчы жанр? Дайце азначэнне паняцця маўленчыя жанры.

7 Якія напрамкі ТМФ развіваюцца ў наш час?

8 Што ўяўляе сабой лінгвістычны напрамак?

9 Што ўяўляе сабой анкета маўленчага жанру як лінгвістычная мадэль МЖ?

10 Якія асноўныя жанраўтваральныя прыкметы МЖ?

11 Назавіце асноўныя тыпы МЖ.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

12 Што ўяўляе сабой прагматычнае жанразнаўства?

**Літаратура**


1 Арутюнова, Н.Д. Жанры общения // Человеческий фактор в языке. Коммуникация, модальность, дейксис. М., 1992.

2 Бахтин, М.М. Эстетика словесного творчества. М., 1979.

3 Богданов, В.В. Классификация речевых актов. Личностные аспекты языкового общения. Калинин, 1989.

4 Дементьев, В.В. Теория речевых жанров. М., 2010.

5 Шерстяных, И.В. Теория речевых жанров. Лекционно-практический курс. М., Флинта: Наука, 2014.

6 Винокур, Т.Г. Говорящий и слушающий. Варианты речевого поведения. – М., 1993.

7 Антология речевых жанров: повседневная коммуникация. – М.: Лабиринт, 2007.

8 Дементьев, В.В. Непрямая коммуникация и ее жанры. – Саратов, 2000.


Станкевіч А.А.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ